**УДК 130.2:141.32**

# ФІЛАСОФСКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЕ АСЭНСАВАННЕ КАТЭГОРЫІ “ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНЫ ВЫБАР”

***Н.С. КЛІШЭВІЧ***
***(Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск)***

*Разглядаюцца генезіс і эвалюцыя канцэпту “экзістэнцыяльны выбар”, выдзяляюцца віды выбару, даецца азначэнне экзістэнцыяльнага выбару і акрэсліваюцца яго характэрныя асаблівасці. Сцвярждаецца думка пра непаўторнасць кожнага экзістэнцыяльнага выбару, аднак існуюць некаторыя агульныя рысы, якія ўплываюць на мадэль паводзін чалавека ў парогавых сітуацыях. Паказана, што праблема экзістэнцыяльнага выбару не можа быць растлумачана толькі ў межах “чыстага розуму”, як дэманструе гісторыя, без сферы трансцэндэнтнага нельга зразумець ні сэнс экзістэнцыі, ні здзяйсненне экзістэнцыяльнага выбару. Экзістэнцыяльны выбар – гэта кароткачасовае дзеянне, вырашальная кропка ў шэрагу маральных выбараў, акт, здзяйсняючы які чалавек праз спазнанне трасцэндэнтнага пераходзіць на новы віток развіцця, у вечнасць.*

Карані ўзнікнення пэўнага тэрміна, як правіла, трэба шукаць у далёкім мінулым. Таму, каб прасачыць генезіс і эвалюцыю паняцця “экзістэнцыяльны выбар”, скарыстаем метад гісторыка-філасофскай рэканструкцыі, агульнанавуковыя метады аналізу, сінтэзу і параўнання і такія спецыфічныя метады, як філасофска-культуралагічны аналіз, а таксама экзістэнцыяльны аналіз.

Упершыню паняцце “выбар” (airesis) выкарыстаў Сакрат у дачыненні да выбару паміж дабром і злом, якія з’яўляюцца галоўнымі этычнымі паняццямі. Цэнтральным пытаннем маральнасці становіцца паняцце “выбар”. Разам з гэтым у сакратаўскай тэорыі ўзнікае своеасаблівае паняцце “ведаў” – “нет ничего сильнее знания, оно всегда и во всем пересиливает и удовольствия, и все прочее” (Платон. Протагор. 357 с.) Тэрмін “веды” ў Сакрата шырэй за яго лексічнае значэнне і набывае, як і “выбар”, маральнае гучанне: чалавек, які ведае, што такое дабро, ніколі не будзе паступаць дрэнна. “Веды” дапамагаюць не памыліцца ў выбары паміж задавальненнем і пакутай. Трэба адзначыць, што Сакрат і Арыстоцель па-рознаму трактавалі тэрміны і наогул разыходзіліся ў іх выкарыстанні. Сакрат часта выкарыстоўваў тэрміны ў парадаксальным, нязвыклым для іх гучанні, у той час як Арыстоцель карыстаўся імі зыходзячы з іх лексічнага значэння. Паводле Арыстоцеля, “выбар” мае наступныя характарыстыкі: свядомы; супрацьпастаўлены задавальненню; адрозны ад жадання (жадаць можна і немагчымага, жаданне накіравана на мэту); накіраваны на тое, што залежыць ад чалавека; як свядомы выбар ажыццяўляецца адносна таго, што вядома чалавеку; характарызуецца “дабрадзейнасцю”; прадмет выбару “загадзя строга вызначаны” папярэднім пошукам.

Выбар выступае як наяўнасць розных варыянтаў для ажыццяўлення волі, з’ўляецца своеасаблівай формай праявы свабоды. Любое рашэнне прымаецца спачатку розумам, які падрыхтоўвае глебу для свабоднага выбару. Выбар рэалізуецца інфармаванай воляй: яна кіруе розумам, прадпісваючы яму прыняцце рашэнняў, хаця розум і дае волі адпаведныя мэты і сродкі выбару. Выбар з’яўляецца свабодным, калі да яго далучаны ўсе інтэлектуальныя і валявыя здольнасці асобы і калі маральныя патрабаванні зліваюцца з яе ўнутранымі запатрабаваннямі. Калі ж месца розуму займаюць пачуцці страху ці абавязку, выбар становіцца абмежаваным і несвабодным. Несвабодным з’яўляецца таксама выбар, выкліканы прымусам ці самаапраўданнем, а волевыяўленне асобы абцяжарана супярэчнасцямі: жадаю, магу, трэба. Такім чынам, маральная воля – не проста выбар нашых паводзін, а пераўтварэнне маральных патрабаванняў ва ўнутраныя запатрабаванні і перакананні чалавека, г. зн. ва ўнутраны выбар.

У адрозненне ад Арыстоцеля, які лічыў, што дабрадзейнасць адвольная ў такой жа ступені, што і загана, і заганны гэтак жа самастойны, як і дабрадзейны, калі не ў мэтах, то хаця б ва ўчынках. Аўгусцін вызначае, што свабода выбару чалавека ў стаўленні да дабра і зла розная: чалавек вольны самастойна абраць грэх, выбар жа выгоды (блага) залежыць ад Божай мілаты, паколькі добрая воля – гэта дар, і як усялякі дар яна ад Бога. Такая пазіцыя сцвярджалася Аўгусцінам у палеміцы з Пелагіем, які вучыў, што прадметам выбару чалавека з’яўляюцца ў роўнай меры дабро і зло [1, с. 532 – 557].

Наогул, у гісторыі філасофскай і культуралагічнай думкі, як зазначае Р.Г. Апрэсян, выказваліся два асноўныя погляды адносна выбару: 1) чалавек можа адвольна выбіраць толькі ўчынкі як сродкі дасягнення першапачаткова зададзенай вышэйшай мэты (Арыстоцель, Аўгусцін, Лок); 2) уласна маральны сэнс мае толькі выбар вышэйшай мэты (Кант, Гегель, Сартр). Так, І. Кант лічыць, што маральная задача чалавека складаецца ў выніку выбару дзеяння, якое адпавядае абавязку – па катэгарычным імператыве. Выбар сродкаў ажыццяўлення абавязку І. Кант адносіў да вядзення маральнай прагматыкі. Па Гегелю, здольнасць да выбару – найбольш агульная характарыстыка чалавека і найпрацейшае выяўленне яго волі;

ажыццяўляючы выбар, чалавек сцвярджае сябе ў якасці чалавека. Калі Сартр кажа пра выбар, то прадметам яго развагі з'яўляецца толькі экзістэнцыяльнае самавызначэнне чалавека: кожным сваім учынкам ён выбірае так, быццам за яго плячыма стаіць чалавецтва, г. зн., "чалавек адказны за ўсё", а адказны чалавек не можа не выбіраць. Антрапалагічны кірунак звязвае лёс філасофіі са зваротам да "чалавека ўнутранага", не ў спазнанні, дзе чалавек "рэч сярод іншых рэчаў", а ў непаўторнасці яго ўнутраных перажыванняў, у свеце яго каштоўнасцей, у "няўлоўным акце самаажыццяўлення, самастварэння, узвышае яго над рэаліямі прыроды і соцыума, а ў адмысловай структуры яго ўнутранага свету бачыцца сутнасць чалавечага быцця, а ў яго тлумачэнні, прадмет філасофіі" [5].

Паняцце экзістэнцыяльны выбар імпліцытна пачынае гучаць у такіх антрапалагічных кірунках, як філасофія жыцця (яе культурна-гістарычны варыянт (Дзільтэй), аксіялагічны варыянт неакантыянства (Бадэнская школа (Віндэльбанд, Рыкерт)), фенаменалогія (Э. Гусерль), экзістэнцыялізм (Ф. Дастаеўскі, Ж.-П. Сартр, А. Камю) і філасофская антрапалогія (М. Шэлер, Х. Плеснер), бо ў выніку антрапалагічнага павароту на першае месца выходзяць чалавек, яго ўнутраны свет, перажыванні.

Ля вытокаў антрапалагічнага кірунку стаіць дацкі мысліцель С. К'еркегор, які прапанаваў свой падыход да пераадолення гегелеўскай філасофіі. Ён успрыняў гегелеўскую сістэму як апафеоз спазнання абстрактнага і агульнага над трагічным лёсам непаўторнага быцця асобы, якая трапіла ў гэты свет на непрацяглы час. Сутнасці (эсэнцыі) ён супрацьпаставіў існаванне (экзістэнцыю) і разумеў яе не як праяву сутнасці, а як непаўторную каштоўнасць, якая праз цяжкія пошукі самой сябе знаходзіць свой шлях да Бога (да трансцэндэнцыі).

Шэлер звяртаецца да некаторых даступных спазнанню спосабаў паводзін чалавека і гаворыць пра надбіялагічныя, духоўныя дзеянні, якія прывядуць чалавека за межы яго прасторава-часавай арганізацыі. У выніку чалавек характарызуецца як істота, якая трансцэндуе самога сябе, сваё і ўсякае іншае жыццё. Аднак у Шэлера сам акт саматрансцэндавання абмяжоўваецца чыста рэлігійным актам. "Не человек молится – он есть молитва жизни, осуществленная поверх него самого, он не ищет бога – он тот <…>, которого ищет бог!" [7, с. 101].

Гістарычна праблематыка выбару першапачаткова распрацоўвалася ў кантэксце праблемы свабоды волі, і ўсе спрэчкі зводзіліся да таго, ці можа чалавек здзяйсняць свабодны (не дэтэрмінаваны звонку) выбар, ці ён прадвызначаны Боскім прадвызначэннем, лёсам, сукупнасцю натуральных законаў. Свабода волі – здольнасць чалавека самастойна, у адпаведнасці са сваім светапоглядам, вызначаць свае ўчынкі, дзейнічаць на падставе асабістага рашэння. Калі сітуацыя выступае прымусам да прыняцця рашэння, то свабода складаецца з уласна рашэння, што мае на ўвазе аналіз "парогавай сітуацыі" (К. Ясперс, Ж.-П. Сартр, А. Камю), параўнанне магчымых варыянтаў паводзін, ацэнку наступстваў выбару. У гэтай парогавай сітуацыі чалавек уяўна пераглядае пройдзены шлях, быццам па-новаму "накідвае чарнавік лёсу", у чымсьці ўпэўніваецца, штосьці адхіляе. Чалавеку даводзіцца супрацьстаяць абставінам, адказваць за свае дзеянні.

Найбольш выразна катэгорыя "экзістэнцыяльны выбар" пачынае гучаць менавіта ў філасофіі экзістэнцыялізму. Экзістэнцыялізм (ад фр. *existentialisme*, ад. лат. *exsistentia* – існаванне) – кірунак, які выводзіць на першы план абсалютную ўнікальнасць чалавечага быцця. Чалавек разглядаецца як асаблівы пачатак у свеце, які тлумачыцца зыходзячы з яго персанальнага вопыту і лёсу, адмаўляючыся ад агульных стандартаў і каштоўнасцей. Экзістэнцыялізм з'явіўся на глебе песімістычнага погляду на эпоху Асветніцтва і нямецкую класічную філасофію, калі тэхнічны, навуковы і маральны прагрэс выліўся ў сусветныя войны і таталітарызм.

Росквітам экзістэнцыялізму можна лічыць вайну з фашызмам, таму што толькі ў парогавым стане, сам-насам са смерцю, чалавек знаходзіць сваю сутнасць, "экзістэнцыю". Менавіта вайна і парогавыя сітуацыі падчас катаклізмаў у грамадстве з'явіліся своеасаблівай лабараторыяй для выяўлення канцэпту "экзістэнцыяльны выбар". У экзістэнцыялізме, як і ў іншых кірунках філасофіі і культуралогіі, праяўляецца нацыянальная спецыфіка. Так, можна гаварыць пра нямецкі, французскі, італьянскі экзістэнцыялізм. Французскі экзістэнцыялізм, напрыклад, меў асаблівы ўплыў у гады Другой сусветнай вайны, прычым Ж.-П. Сартр, А. Камю, С. дэ Бавуар былі не толькі актыўнымі ўдзельнікамі, але і ідэолагамі руху «Супраціўлення» ў сваёй краіне. Не выпадкова менавіта ў ваенны і пасляваенны перыяды нарадзіліся найбольш значныя творы французскіх экзістэнцыялістаў.

Сусветныя праблемы паўплывалі і на беларускую філасофію і культуру. Цяжка сказаць, адкуль бярэ свой пачатак беларускі экзістэнцыялізм, бо гэтае пытанне яшчэ не дастаткова даследавана. Аднак экзістэнцыяльныя матывы гучаць ужо ў творчасці М. Гарэцкага, К. Чорнага, С. Алексіевіч, В. Быкава. У гады Вялікай Айчыннай вайны гэты накірунак набывае асаблівую актуальнасць на тэрыторыі рэспублікі. Пытанні сутнасці існавання ў гэты час становяцца галоўнымі як для асобы, так і для нацыі, а праблема экзістэнцыяльнага выбару пачынае гучаць ў творчасці пісьменнікаў-франтавікоў і "дзяцей вайны". Першым, хто сваёй творчасцю падобны да ідэй французскіх экзістэнцыялістаў, з'яўляецца народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, творчасці якога характэрны шматлікія парогавыя сітуацыі, сітуацыі ма-

ральнага выбару, глыбокі псіхалагізм аўтарскай манеры пісьма. Вайна стала для пісьменніка той школай, тым невычэрпным пластом, калі маўчаць ўжо не было моцы, а дзейнічаць для пісьменніка азначала гаварыць пра каштоўнасць асабістага вопыту, пра складаны і загадкавы чалавечы лёс, пра нечалавечыя пакуты існавання ў тагачаснай рэчаіснасці і адсутнасць выхаду з розных сітуацый, калі самае цэннае, што можа быць ў жыцці, ператвараецца ў хлусню, калі няма выхаду са складаных сітуацый, калі свае становяцца ворагамі – сярод гэтых нечалавечых паводзін адных людзей і абсалютнай ахвярнасці іншых і ўзнікае *экзістэнцыяльны выбар* як выйсце з крытычнай сітуацыі, няхай і за межы зямнога існавання, але захаваўшы праўду жыцця і сваё чалавечае аблічча.

Звычайна выбар падзяляюць на просты, сэнсавы і экзістэнцыяльны (асобасны). Калі браць агульную фармулёўку, то выбар – вырашэнне нявызначанасці на пэўных узроўнях чалавечай дзейнасці ва ўмовах вялікай колькасці альтэрнатыў [6, с. 81]. У псіхалогіі асобы выбар разглядаецца як асобасная гатоўнасць прыняць на сябе адказнасць за яго вынікі. Экзістэнцыяльны выбар прадугледжвае, што крытэрыі перавагі і альтэрнатывы не задаюцца, а ўсё будуецца самім суб’ектам (Д.А. Лявонцьеў).

У псіхалогіі тэрмін “экзістэнцыяльны выбар”, на нашу думку, набывае крыху іншае гучанне. Гэта звязана, напэўна, з тым, што псіхолаг працуе з чалавекам як з ужо існуючым праектам і ў момант стварэння “новага” чалавека “памірае” ранейшы, і так здараецца на кожным этапе наступнага жыццёвага выбару. Усякі выбар – рэалізацыя адной абранай магчымасці і адхіленне ўсіх астатніх. Выбіраючы, чалавек павінен вырашыць, што з існуючага ён зробіць рэальнасцю, прычым пакуты выбару звязаны менавіта з усведамленнем непазбежнай страты, асабліва калі даводзіцца выбіраць паміж двума і больш роўнымі па значнасці каштоўнасцямі. У свой час М. Бярдзяеў сцвярджаў, што выбар паміж дзвюма аднолькавымі станоўчымі або адмоўнымі каштоўнасцямі на карысць меншага зла, напрыклад, не вырашае праблему выкаранення зла і характарызуецца неадназначнасцю і трагізмам. [4, с. 31 – 54], таму любое рашэнне ўжо непазбежна ўтрымлівае ў сабе адмову: у любога “так” ёсць сваё “не”, кожнае прынятае рашэнне цалкам адхіляе ўсе астатнія магчымасці. Корань слова “вырашыць” (decide), лічыць Ірвін Ялам, азначае “забіць”, як у словах “homicide” (забойства) і “suicide” (самагубства)” [8, с. 17].

Адкладаючы момант прыняцця рашэння, чалавек думае, што ў яго распараджэнні маюцца ўсе магчымасці адначасова, і нежаданне расставацца з уяўнай усемагутнасцю ў выніку прыводзіць да поўнай адсутнасці выбару – за яго пачынаюць выбіраць абставіны.

У сучаснай культуры і этыцы праблема маральнага і экзістэнцыяльнага выбару даследуецца ў кантэксце вырашэння маральных канфліктаў, барацьбы матываў дабра і зла. Таму прадметам разгляду з’яўляецца ўсвядомлены выбар пры ясным разуменні альтэрнатыў.

Важна адзначыць, што любая сітуацыя экзістэнцыяльнага выбару мае ўласную гісторыю развіцця. Сітуацыя экзістэнцыяльнага выбару характарызуецца сваёй непаўторнасцю, непрадказальнасцю, адзінкавасцю. Нельга дакладна вызначыць, як будзе паводзіць сабе чалавек у рашаючы момант экзістэнцыяльнага выбару. Гэта залежыць ад многіх фактараў – ад маленькіх выбараў чалавека праз усё жыццё, ад загартаванасці яго волі. Мы не можам сцвярджаць, але можам выказваць здагадку, што нават калі ў якасці асноўных катэгорый чалавечага быцця выступаюць клопат, закінутасць, адчужанасць, абсурд, страх, адказнасць, выбар, смерць і інш., чалавек з “інфармаванай воляй” робіць больш прадказальны экзістэнцыяльны выбар. Гэта бачна, напрыклад па героях аповесці “Сотнікаў”, дзе В. Быкаў разам з чытачом імкнецца зразумець, дзе “даў трэшчыну” чалавечы вобраз Рыбака, і чаму адзін чалавек можа “свядома” пайсці на смерць, а другі – не.

Цікава вызначае маральны выбар Р.Г. Апрэсян, падкрэсліваючы яго каштоўнасны сэнс: “Выбар (маральны) – духоўна-практычная сітуацыя самавызначэння асобы ў стаўленні прынцыпаў, рашэнняў і дзеянняў” [2, с. 81 – 82]. Каб выйсці са стану нявызначанасці, чалавек павінен зрабіць уяўны ці рэальны выбар. Рэальны выбар – гэта знаходжанне кожнай з альтэрнатыў у межах магчымасцяў чалавека. Уяўны выбар – гэта такі выбар, калі чалавек выбірае па-за межамі сваіх магчымасцяў і звыш узроўню свайго разумення. Калі чалавек не здольны зрабіць выбар з прадстаўленых яму магчымасцяў і сітуацый, ён можа ажыццявіць выбар свайго стаўлення да дадзенага становішча (Ж.-П. Сартр).

Такім чынам, маральны выбар – гэта працэс, які адбываецца ва ўнутрыасобаснай прасторы ўвесь час. Нельга выбраць раз і назаўсёды, нават калі назіраецца пэўная ілюзія канчатковасці. Чалавек свядома ўтрымлівае сябе ў абранай кропцы, і гэта ўтрымліванне самога сябе, адмова ад змен таксама з’яўляюцца выбарам. Гэты ўяўны спакой і нязменнасць могуць каштаваць вялікіх маральных, інтэлектуальных і эмацыйных сіл і валодаць каштоўнасным сэнсам.

У цэлым маральны выбар – дзейнасць, у якой велізарная роля належыць ірацыянальным кампанентам свядомасці: пачуццям, перажываннням, звычкам, інтуіцыі. Тым не менш неабходнасць рацыянальнага падыходу да гэтага працэсу відавочная, і ўзмацненне рацыянальнага кампанента ўяўляецца магчымым менавіта за кошт глыбейшага спазнання ірацыянальных аспектаў з дапамогай рэфлексіі. Такое спазнанне адбываецца як сродкамі акадэмічнай навукі з дапамогай распрацаваных тэорый і методык, так і эмпірычным шляхам – праз вывучэнне чалавека ў пэўных сітуацыях маральнага выбару.

У навуковай літаратуры часцей за ўсё выкарыстоўваецца канцэпт “выбар” альбо “маральны выбар”, а “экзістэнцыяльны выбар” часта атаясамліваецца з маральным, гэта ў нейкай ступені апраўдана, паколькі экзістэнцыяльны выбар мае на ўвазе ў тым ліку і маральнае самавызначэнне асобы. Аднак экзістэнцыяльны выбар, на нашу думку, характарызуецца надрэальнасцю, звышмэтай, абсалютам, таму што маральны выбар – гэта не заўсёды выбар на мяжы жыцця і смерці, а экзістэнцыяльны выбар (альбо-альбо) характарызуецца адназначнасцю.

Сітуацыі выбару і адказнасці належаць да ліку праблем, рашэнне якіх мае не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Менавіта ў гэтай кропцы адцягненая філасофская тэорыя маральнасці непасрэдна злучаецца з нарматыўнай этыкай і з рэальнай практыкай чалавечых паводзін. Калі маральны выбар – гэта выбар каштоўнасных арыенціраў, то экзістэнцыяльны выбар – гэта своеасаблівая кропка, момант, калі чалавек абраў для сябе рашэнне, ад якога залежыць далейшае існаванне чалавека.

Пра складанасць экзістэнцыяльнага выбару як феномена сведчыць і тое, што ён непаўторны і ў кожным выпадку ўнікальны. Яго нават можна параўнаць з кропкай біфуркацыі. Яшчэ адной характарыстыкай экзістэнцыяльнага выбару з’яўляецца яго бінарнасць. У чалавечай прыродзе быццам бы існуюць два пачаткі – зямны і нябесны. Супярэчнасці маральнага закону і грахоўнасці прыводзяць да экзістэнцыяльнага канфлікту. “Доброго, которого хочу, не делаю, а злое, которого не хочу, делаю… Итак, я нахожу закон, что когда хочу делать доброе, прилежит мне злое” [Послание к Римлянам, гл. 7, стих 19, 21], – гэта пакутлівая антыномія чалавечага светаадчування, выказаная апосталам Паўлам, праходзіць праз усю гісторыю чалавецтва. Розная прырода пачаткаў прымушае чалавека балансаваць на мяжы магчымасці і немагчымасці, дазволенасці і недазволенасці, але гэта не парушае цэласнасці асобы. У пазнейшых працах М. Шэлер гаворыў пра антытэзу “парыву і духа”, дзе пад “парывам” разумеецца дэманічны пачатак (бязмэтава-хаатычныя магутныя сілы мёртвай матэрыі (зло)), а пад “духам” – вышэйшыя ідэалы, эмацыйна-каштоўнасныя формы быцця як у асобасным вымярэнні, так і ў больш шырокіх вымярэннях зместу культуры.

Дваццаць першае стагоддзе характарызуецца пераломным станам культуры, гэта эпоха інфармацыйных тэхналогій, інавацый. Увядзенне новага ва ўсе сферы чалавечага жыцця – гэта рух наперад дзеля развіцця грамадства. Але ў пагоні за новым нельга забывацца пра цэласнасць і ўнікальнасць асобы, пра маральныя арыенціры, маральныя каштоўнасці, якія мы павінны перадаць наступным “інфармацыйным” людзям. Навукоўцы шукаюць новыя тлумачэнні вядомых феноменаў, і можа здарыцца так, што ілюзія бясконцага сну стане адным са спосабаў чалавечага існавання. Чалавек выбірае, зыходзячы са свайго сённяшняга стану пачуццяў, думак, патрабаванняў, прыхільнасцяў і г.д. Аднак ніхто не ведае, як зменіцца яго асоба праз нейкі час – магчыма, успрымаць іх будзе ўжо зусім іншы чалавек з іншымі характаралагічнымі асаблівасцямі. Наўрад ці магчыма настолькі глыбока зразумець самога сябе, каб прадказаць магчымыя будучыя змены ў глыбіннай структуры асобы. Часта бывае так, што тыя надзеі, якія ўскладаліся на дасягненне якіх-небудзь мэт, не спраўдзіліся, і гэта прыводзіць асобу да адчаю і безвыходнасці.

У сучасным грамадстве праблем таксама шмат: прыродныя катаклізмы, масавыя эпідэміі, захворванні, якія вядуць да смерці, тэрарызм – усё гэта прымушае здзяйсняць экзістэнцыяльны выбар. І трэба зрабіць так, каб намаганні па дасягненні жыццёвых мэт не проста прыводзілі да поспеху, але і захоўвалі сваю каштоўнасць, не выклікалі глыбокіх расчараванняў. Калі ісці па шляху дакладнага, дэталёвага прадказання паводзін чалавека пры вывучэнні экзістэнцыяльнага выбару, то можна трапіць у тупік. Чалавек сам па сабе складаны і зменлівы, але спазнанне і самапазнанне магчымыя. У першую чаргу ўспомнім пра тое, што свядомасць чалавека не зводзіцца толькі да рацыянальнай яго часткі. Тое, што недаступна рацыянальным ведам пры простым разважанні, можа быць дасягнута іншымі спосабамі. Феномены “прарочых” сноў, прадчуванняў, нейкіх невыразных унутраных сумненняў ці ні на чым не заснаванай упэўненасці даволі часта апісваюцца не толькі ў мастацкай, але і ў філасофскай літаратуры. Аднак атрымаць такія веды, якія можна яшчэ назваць інтуітыўнымі, ці глыбіннымі, магчыма.

Экзістэнцыяльны выбар – гэта своеасаблівы выбар вечнасці не як бясконцага ланцуга часу, а абсалютнай свабоды ад часовых вымярэнняў. Ён як бы знаходзіцца па-за часам. Такое паняцце “вечнасці” падобна да фармулёўкі гэтага паняцця ў М.А. Лоскага. У артыкуле “Вечнасць і экзістэнцыя” М.С. Увараў адзначае, што менавіта А. Майцэна знайшоў мяжу пераходу экзістэнцыі ад часу ў вечнасць. На яго думку, час роўны экзістэнцыі, якая з’яўляецца і здзяйсненнем, і дзейнасцю. Тое, што бывае ў часе і па-за часам, заканчваецца. Сапраўдны чалавек экзісціруе толькі ў вечнасці [3, с. 253].

Так, экзістэнцыяльны выбар мае наступныя характарыстыкі:

- *“парогавая сітуацыя”* (К. Ясперс). Але на сучасным этапе, асабліва ў псіхатэрапіі, гаворка, хутчэй, ідзе пра змену жыццёвых пазіцый, пераломнасці шляху, калі з прыняццем таго ці іншага рашэння змяняецца жыццёвы шлях чалавека;
- *змена каштоўнасных арыентацый*, а разам з гэтым і ўчынкаў;
- неад’емная характарыстыка – *свабода* (недэтэрмінаванасць зверху) і адказнасць;

- *складанасць і супярэчлівасць* выбару, бо чалавек увесь час знаходзіцца паміж супрацьлегласцямі, антыноміямі-палярнасцямі, у супрацьстаянні паміж свядомасцю непазбежнасці смерці і жаданнем жыць, паміж імкненнем да свабоды і жахам перад яе адсутнасцю;
- *непрадказальнасць*, улічваючы ўнікальнасць кожнага чалавека, а таксама абсалютнае няведанне таго, што у пэўны момант часу зробіць сваім выбарам чалавек;
- у адрозненне ад маральнага выбару, экзістэнцыяльны выбар характарызуецца *кароткачасовасцю*;
- характарыстыкай экзістэнцыяльнага выбару можна лічыць наяўнасць *экзістэнцыяльнай трывогі*, якую нараджае неабходнасць здзяйсняць экзістэнцыяльны выбар (С. К'еркегор, М. Хайдэгер, Ж-П. Сартр, Р. Мэй).

Такім чынам, праблема экзістэнцыяльнага выбару не можа быць растлумачана толькі ў межах "чыстага розуму". Гісторыя дэманструе, што без сферы трансцэндэнтнага нельга зразумець ні сэнс экзістэнцыі, ні здзяйсненне экзістэнцыяльнага выбару. У разуменні аўтара экзістэнцыяльны выбар – гэта кароткачасовае дзеянне (момант), вырашальная кропка ў шэрагу маральных выбараў, акт, здзяйсняючы які чалавек праз спазнанне трасцэндэнтнага пераходзіць на новы віток развіцця, у вечнасць.

ЛІТАРАТУРА

1. Гусейнов, А.А. Августин. О благодати и свободном произволении / А.А. Гусейнов, Г. Иррлитц // Краткая история этики. – М.: Мысль, 1987.
2. Апресян, Р.Г. Этика: энциклопедический словарь / Р.Г. Апресян. – М.: Гардарики, 2001.
3. Бердяев, Н.А. О назначении человека / Н.А. Бердяев. – М.: Мысль, 1993.
4. Майцена, А. Драма Иова / А. Майцена. – СПб., 2000.
5. Саготовский, В.Н. Философия развивающейся гармонии / В.Н. Сагатовский. – СПб., 1999. – Ч. 3: Антропология [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://anthropology.ru/ru/texts/sagatovsk/ /acosm_7.html#para4-1Dhtvz. – Дата доступа: 22.02.2013.
6. Человек. Философско-энциклопедический словарь. – М.: Наука, 2000. – 516 с.
7. Шелер, М. К идее человека / М. Шелер // Человек: образ и сущность. – М., 1991.
8. Ялом, И.Д. Лечение от любви и другие психотерапевтические новеллы / И.Д. Ялом. – М., 1997.

*Паступіў 24.04.2013*

## PHILOSOPHICAL AND CULTUROLOGICAL COMPREHENSION OF THE CATEGORY "EXISTENTIAL CHOICE"

***N. KLISHEVICH***

*In the article genesis and evolution of the existential choice concept are considered, types of choice are singled out, definition of the existential choice is given and its defining characteristics are outlined. The author takes up the position that each existential choice is unique, and yet there exist some common characteristics that influence the behavior model of a person in liminal situations. It is shown that the problem of existential choice cannot be explained only within the scope of "clear mind", as history demonstrates, without the sphere of transcendent it is impossible to understand neither the essence of existence nor making an existential choice. Existential choice is a short-term action, the final step in the number of moral choices, an action, doing which a person moves to a new round of development, into the eternity.*